*В. С. Болбас, А. Слядоўская (г. Мазыр)*

# МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АСОБНЫХ ВІДАЎ ФАЛЬКЛОРУ

У народна-выхаваўчай сістэме фальклору належыць адно з самых пачэсных месц. Адначасова ён з'яўляецца скарбонкай і генератарам ідэй народнай педагогікі, незаменным і эфектыўным сродкам выхавання. Апрацаваны і адшліфаваны шматвяковым жыццёвым вопытам і народнай мудрасцю, ён садзейнічаў і сёння садзейнічае ўсталяванню правіл сумеснага, супольнага жыцця, гарманізацыі адносін індывіда і грамадства.

І гэтак жа як выніковасць народна-выхаваўчай практыкі вызначаецца цэласнасцю, сінхроннасцю ўздзеяння на выхаванцаў шматлікіх фактараў, так і педагагічная каштоўнасць фальклору множыцца наяўнасцю выхаваўчага патэнцыялу ва ўсіх яго відах і жанрах. На жаль, педагагічны аспект многіх з іх да сёняшняга дня не вывучаны і не запатрабаваны педагагічнай навукай. Так, вывучэнне народных галашэнняў дазволіла выявіць у іх істотны маральна-выхаваўчы патэнцыял. Многія з відаў народных галашэнняў яшчэ знаходзяць месца ў побыце беларусаў, асобныя знаходзяцца толькі ў народнай памяці. Тым не менш іх вывучэнне для сучаснасці мае не толькі пазнавальную каштоўнасць. Адмаўляючыся ад прамой іх экстрапаляцыі ў сучаснасць, многія моманты і падыходы можна ўзяць наўзбраенне і тэарэтыкам, і практыкам.

Народныя галашэнні выконваліся ў пераломныя моманты жыцця чалавека. Яны былі споведдзю на міру, спосабам выражэння ўнутранага стану людзей. Дзякуючы спецыфічнасці іх пабудовы і выканання, стварэнню своеасаблівага эмацыянальнага настрою, яны глыбока ўздзейнічалі на розум і пачуцці людзей. Галашэнні вельмі тонка ўлічвалі псіхалогію людзей, законы іх логікі і ўспрыймання свету. Вясельныя, рэкруцкія, пахавальныя і іншыя галашэнні выхоўвалі ў людзей адпаведныя адносіны да жыцця, акцэнтавалі ўвагу на фарміраванні агульначалавечых маральных якасцей; садзейнічалі ўсталяванню павагі да старэйшых, родных, блізкіх, людзей наогул; вучылі дабрыні, спагадлівасці, міласэрнасці, чуласці, сумленнасці і праўдзівасці.

Народныя замовы апроч усяго іншага выхоўвалі павагу да слова, веру ў яго моц і сілу. Загадкі развівалі цікаўнасць, кемлівасць, дапытлівасць. Калыханкі рыхтавалі да жыцця, знаёмілі з акаляючым светам, уносілі ў душы дзяцей спакой і ўпэўненасць. Нават у дзіцячых лічылках можна заўважыць спробу правядзення мяжы паміж дабром і злом, прыгожым і агідным.

Выхаваўчае ўздзеянне шматлікіх форм і відаў фальклору залежала ад умелай іх арыентацыі на пола-узроставыя асаблівасці дзяцей, адпаведную пару года і іншыя абставіны.